Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
БДУКМ
____________ С. Л. Шпарло
“21” чэрвеня 2024 г.
Рэгістрацыйны № ВД- 6-116 эвуч.

**ФАЛЕРЫСТЫКА**

*Вучэбная праграма ўстановы адукацыі па вучэбнай дысцыпліне*
*для спецыяльнасці*
*6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны*

2024

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарта вышэйшай адукацыі АСВА 6-05-0322-01-2023 па спецыяльнасці 6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны, зацверджанага пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 21.08.2023 № 274, вучэбнага плана БДУКМ па спецыяльнасці 6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны

**СКЛАДАЛЬНІК:**

І. Н. Колабава, дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*П.С.Курловіч,* загадчык кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт», кандыдат гістарычных навук, дацэнт;

*Ю. В. Кавалёва,* загадчык аддзела экспазіцыйна-выставачнай работы Дзяржаўнай установы «Музей гісторыі горада Мінска», кандыдат культуралогіі

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол №6 ад 25.01.2024);

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 4 ад 10.04.2024)

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Модуль “Спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны-2” складаецца з вучэбных дысцыплін “Фалерыстыка”, “Сфрагістыка”, “Анамастыка”, “Метралогія і храналогія”. Дадзеная вучэбная праграма прызначана для вывучэння вучэбнай дысцыпліны “Фалерыстыка”.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Фалерыстыка» спрыяе падрыхтоўцы студэнтаў да практычнай дзейнасці, да больш паглыбленага аналізу і апісання розных відаў гістарычных крыніц. Авалоданне тэарэтычнымі і практычнымі навыкамі ў дадзеным кірунку спрыяе фарміраванню ўсебакова развітога спецыяліста ў галіне музейнай справы і аховы гісторыка-культурнай спадчыны.

Актуальнасць дадзенай вучэбнай дысцыпліны вызначаецца яе роляй у працэсе падрыхтоўкі навуковых супрацоўнікаў музейных і турыстычных устаноў.

*Мэта* выкладання вучэбнай дысцыпліны “Фалерыстыка” – сфарміраваць у студэнтаў першасныя прафесійныя кампетэнцыі ў сферы гісторыі ўзнікнення і фарміравання ўзнагародных сістэм на тэрыторыі Беларусі, накіраваць іх на арганізацыю самастойнай работы па стварэнні і даследаванні музейнай нумізматычнай калекцыі, а таксама выкарыстанне атрыманых ведаў у турыстычнай дзейнасці.

Мэтавая накіраванасць вучэбнай дысцыпліны “Фалерыстыка” акрэслівае шэраг *задач*:

– прасачыць на фактычным матэрыяле гісторыю станаўлення і развіцця ўзнагардных сістэм на беларускіх землях;

– выявіць характэрныя асаблівасці сістэмы аховы гісторыка-культурнай спадчыны ў Беларусі на прыкладзе музейных фалерыстычных калекцый.

– выпрацаваць у студэнтаў уменні па апрацоўцы атрыманай інфармацыі, рабоце з літаратурай і крыніцамі.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Фалерыстыка” накіравана на фарміраванне наступных кампетэнцый:

СК – 4 Прымяняць метады і дасягненні спецыяльных гістарычных дысцыплін для выяўлення, крытычнага аналізу і інтэрпрэтацыі музейных крыніц.

СК – 5 Планаваць і выконваць работу па бягучаму і перспектыўнаму камплектаванню музейных калекцый, іх уліку і выкарыстанню ў экспазіцыйна-выставачнай дзейнасці ў адпаведнасці з прававымі нормамі і прынцыпамі музейнай этыкі.

Засваенне вучэбнай дысцыпліны забяспечвае студэнтаў зыходнымі *ведамі аб*:

– прадмеце даследавання спецыяльнай гістарычнай дысцыпліны «Фалерыстыка»;

– гістарычных ўмовах развіцця фалерыстыкі;

– прыёмах даследавання ў дадзеным кірунку;

– методыцы самастойнай работы з крыніцамі і апрацоўцы інфармацыі;
– методыцы выкарыстання набытых ведаў у музейнай і турыстычнай працы;
– навуковых дасягненнях айчынных і замежных даследчыкаў у дадзенай галіне;

Дысцыпліна накіравана на выпрацоўку ў студэнтаў *ўменняў*:
– выкарыстання прыёмаў і метадаў навуковай апрацоўкі музейнай фалерыстычнай калекцыі;
– выкарыстання базавых ведаў пры правядзенні практычнай і навуковай работы;
– выкарыстання інфармацыйных крыніц ў музейнай працы;
– выкарыстання найноўшых навуковых дасягненняў айчынных і замежных даследчыкаў у дадзенай галіне ў фондавай і экспазіцыйнай музейнай рабоце.

Студэнты павінны а*валодаць*:
– навыкамі сістэматызацыі атрыманых ведаў;
– навыкамі стварэння інфармацыйных прадуктаў розных відаў па тэме курса.

Асноўнымі формамі навучання па вучэбнай дысцыпліне з’яўляюцца лекцыі і семінарскія заняткі, заданні для самастойнай работы студэнтаў.

Замацаванне атрыманых ведаў мае працяг пры праходжанні вучэбнай і вытворчай практыкі ў музеях краіны, у фондах якіх знаходзяцца фалерыстычныя калекцыі.

Пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны “Фалерыстыка” выкарыстоўваюцца сучасныя метады навучання і кампутарныя тэхналогіі.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкарыстоўваюцца рэйтынгавыя, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай работы, вучэбна-метадычныя комплексы. У практыку правядзення семінарскіх заняткаў укараняюцца методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя формы.

Вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне «Фалерыстыка» распрацавана з улікам пастаўленых задач, узгоднена з праграмамі іншых вучэбных дысцыплін, якія выкладаюцца на кафедры гісторыка-культурнай спадчыны («Археалогія», «Этналогія Беларусі», «Гісторыя Беларусі» і інш.).

У адпаведнасці з вучэбным планам на выкладанне вучэбнай дысцыпліны «Фалерыстыка» усяго прадугледжана 40 аўдыторных гадзін. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін: па відах заняткаў: лекцыі – 30 гадзіны, семінарскія – 10 гадзін. Форма правядзення бягучай атэстацыі – вуснае апытанне. Форма правядзення прамежкавай атэстацыі – экзамен.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

*Уводзіны. Прадмет,задачы і крыніцы фалерыстычных даследаванняў. Гістарыяграфічны агляд*

Вызначэнне фалерыстыкі як навуковай дысцыпліны. Этымалогія тэрміна фалерыстыка. Прадмет, задачы, крыніцы фалерыстыкі (узнагародныя знакі, узнагародная дакументацыя, выяўленчыя крыніцы, кінафотадакументы і інш.). Гістарыяграфічны агляд развіцця фалерыстыкі.

Сувязь фалерыстыкі з іншымі гістарычнымі дысцыплінамі (нумізматыкай, геральдыкай, сфрагістыкай і інш. ).

Спецыяльная тэрміналогія (ордэн, фалера, фалеронім, інсігнія і інш.).

Класіфікацыя ўзнагарод па каштоўнаснай шкале, матэрыялу, форме, спосабе і правілах нашэння, храналагічнаму прынцыпу, па краінах і інш.

Буйнейшыя фалерыстычныя зборы ў музеях Беларусі.

*Тэма 1 Узнагародная атрыбутыка антычнага свету*

Узнагародныя знакі Старажытнай Грэцыі (фалеры).

Сістэма ўзнагарод Рымскай імперыі. Вянцы (кароны) – узнагароды за ваенныя і грамадзянскія заслугі. Стужкі да карон, узнагародныя ланцугі, бранзалеты, дзіды, фіялы, фалеры і інш.

Традыцыя калектыўных узнагарод. Сігны, сцягі.

*Тэма 2 Манаскія, духоўна-рыцарскія і свецкія ордэны*

Ордэн як манаская ці духоўна-рыцарская арганізацыя.

Узнікненне хрысціянскага манаства. Кляштары.

Манаскія ордэны бенедыкцінцаў, цыстэрцыянцаў, бернардзінцаў. Клюнійская рэформа. Сутнасць і наступствы.

Мэта стварэння жабрацкіх манаскіх ордэнаў: францысканцаў, дамініканцаў, аўгусцінцаў, кармелітаў.

Ордэн езуітаў. Мэта стварэння і дзейнасць.

Манаскія ордэны – актыўныя ўдзельнікі крыжовых паходаў.

Мэты заснавання і структура манаска-рыцарскіх ордэнаў. Буйнейшыя манаска-рыцарскія ордэны: Мальтыйскі ордэн, ордэн Тампліераў, Тэўтонскі ордэн.

Масонства (франкмасонства) – таемнае рэлігійна-этычнае таварыства.

*Тэма 3 Ордэн – узнагародны знак за вайсковыя і грамадзянскія заслугі. Медаль*

Пераемнасць паміж манаскімі, манаска-рыцарскімі і свецкімі ордэнамі.

Агульная характарыстыка і асаблівасці свецкіх ордэнаў. Статут, ступені, стужка (ланцуг), дэвіз, правілы нашэння знака ордэна. Гісторыя ўзнікнення і правілы нашэння ордэнскай зоркі.

Медаль. Гісторыя ўзнікнення і выкарыстання. Тэхніка вырабу. Віды медалёў (мемарыяльныя, юбілейныя, узнагародныя). Тэматычная класіфікацыя медалёў.

*Тэма 4 Узнагародныя сістэмы Вялікабрытаніі, Гальшчініі, Гішпаніі, Даніі, Прусіі, Францыі, Швецыі*

Вялікабрытанія. Ордэн Падвязкі. Гісторыя заснавання (1348/1350). Паходжанне назвы ордэна. Знакі ордэна, дэвіз.

Ордэн Лазні. Гісторыя заснавання (1399). Паходжанне назвы. Знак ордэна, дэвіз.

Гішпанія. Ордэн Залатога Руна. Гісторыя заснавання (1429). Паходжанне назвы ордэна. Знакі ордэна, дэвізы.

Данія. Ордэн Слана. Гісторыя заснавання (1458, 1462). Паходжанне назвы ордэна. Знак ордэна, дэвіз.

Прусія. Ордэн Жалезнага Крыжа. Гісторыя заснавання (1812). Знак ордэна.

Францыя. Ордэн Святога Духа. Гісторыя заснавання (1579). Знак ордэна.

Ордэн Ганаровага Легіёна. Гісторыя заснавання (1802). Знакі ордэна, дэвіз.

Швецыя. Ордэн Серафімаў. Знакі ордэна, дэвіз.

Ваенны ордэн Мяча. Знакі ордэна, дэвіз.

Ордэн Палярнай Зоркі. Знак ордэна, дэвіз, ступені.

*Тэма 5 Узнагародная сістэма Рэчы Паспалітай*

Традыцыі ўзнагароджвання за вайсковыя і цывільныя заслугі ў Вялікім Княстве Літоўскім.

Асаблівасці палітычнай сістэмы Рэчы Паспалітай, якія тармазілі пачатак фарміравання ўласнай узнагароднай сістэмы краіны.

Гісторыя няўдалай спробы заснавання ордэна Бязгрэшнага Зачацця Дзевы Марыі. Статут, знак ордэна, ланцуг (стужка), дэвіз.

Ордэн Белага Арла. Гісторыя заснавання (1705–1713). Ордэн Белага Арла – найвышэйшы ўзнагародны знак. Статут, знак ордэна, ордэнская зорка, стужка, дэвіз, правілы нашэння.

Ордэн Святога Станіслава. Гісторыя заснавання ордэна (1765). Статут, знак ордэна, ордэнская зорка, стужка, дэвіз, правілы нашэння.

Ордэн Вайсковага Крыжа (ордэн “Virtuti Militari”). Гісторыя заснавання ордэна (1792). Статут, знакі ордэна, ордэнская зорка, стужка, дэвіз, ступені, правілы нашэння.

Узнагародныя медалі Рэчы Паспалітай. Прызначэнне, знешні выгляд.

Узнагароды часоў паўстання 1794 г.

*Тэма 6 Узнагародная сістэма Расіі (да 1917)*

Традыцыі ўзнагароджвання за ваенныя і цывільныя заслугі ў Расіі. “Залатыя”.

Ордэн Святога Апостала Андрэя Першазванага. Гісторыя заснавання ордэна (1698/1699). Ордэн Андрэя Першазванага – найвышэйшы ордэн краіны. Статут, знак ордэна, ордэнская зорка, стужка, дэвіз, правілы нашэння. Кавалеры ордэна.

Ордэн Святой Вялікапакутніцы Кацярыны. Гісторыя заснавання ордэна (1714). Статут, знакі ордэна, ордэнская зорка, стужка, дэвіз, ступені, правілы нашэння.

Ордэн Святога Дабравернага Аляксандра Неўскага. Гісторыя заснавання ордэна (1725). Статут, знак ордэна, ордэнская зорка, стужка, дэвіз, правілы нашэння.

Вайсковы ордэн Святога Вялікапакутніка і Перамоганосца Георгія. Гісторыя заснавання ордэна (1769). Ордэн Святога Георгія – найвышэйшы ваенны ордэн краіны. Статут, знакі ордэна, ордэнская зорка, стужка, дэвіз, ступені, правілы нашэння. Поўныя кавалеры ордэна.

Сістэма георгіеўскіх узнагарод. Пяць баявых афіцэрскіх залатых крыжоў, знак узнагароды Ваеннага ордэна (Георгіеўскі Крыж), медаль "За храбрасць" (Георгіеўскі медаль), георгіеўскія адрозненні для вайсковых частак (георгіеўскія сцягі і трубы), цямляк з георгіеўскай стужкі і эмалевы крыжык.

Ордэн Святога Раўнаапостальскага князя Уладзіміра. Гісторыя заснавання ордэна (1782). Статут, знакі ордэна, ордэнская зорка, стужка, дэвіз, ступені, правілы нашэння.

Ордэн Святой Ганны. Гісторыя заснавання ордэна (1735). Увядзенне ордэна ва ўзнагародную сістэму Расіі (1797). Статут, знакі ордэна, ордэнская зорка, стужка, дэвіз, ступені, правілы нашэння.

Ордэн Святога Іаанна Іерусалімскага. Увядзенне ордэна ва ўзнагародную сістэму Расіі (1797). Статут, знакі ордэна, ордэнская зорка, стужка, ступені, правілы нашэння.

Увядзенне ва ўзнагародную сістэму Расійскай імперыі ордэнаў Белага Арла, Святога Станіслава і Вайсковага Крыжа (1831). Асаблівасці расійскіх варыянтаў гэтых ордэнаў.

Узнагародныя медалі.

*Тэма 7 Узнагароды Белага Руху*

Спецыфічныя ўмовы фарміравання ўзнагароднай сістэмы Белага Руху.

Узнагародныя знакі Белага Руху (знак 1-га Кубанскага (Лядовага) паходу, ордэн Свяціцеля Мікалая Цудатворцы, Крыж (ордэн) Архангела Міхаіла і інш.).

Калектыўныя ўзнагароды (сцягі, трубы).

Знакі (крыжы) рускай арміі, заснаваныя ў эміграцыі.

*Тэма 8 Узнагароды БНР і беларускай эміграцыі*

Спроба стварэння ўласнай дзяржаўнай сістэмы ўзнагарод Беларускай Народнай Рэспублікі. Крыж Пагоні, Полацкі Беларускі Крыж (Беларускі Крыж Святой Ефрасінні Полацкай).

Узнагародныя знакі Беларускай Цэнтральнай Рады (1944). Ордэн "Залаты Крыж Заслугі з мечамі", ордэн "Залаты Крыж Заслугі", ордэн "Срэбны Крыж Заслугі з мечамі", ордэн "Срэбны Крыж Заслугі", ордэн "Жалезны Крыж Заслугі з мечамі", ордэн "Жалезны Крыж Заслугі".

Узнагародныя знакі Рады БНР у эміграцыі (1949–1952). Ордэн Пагоні, вайсковы ордэн Жалезнага Рыцара, ордэн "Медаль Партызана".

Узнагароды Беларускай Цэнтральнай Рады ў эміграцыі (1976). Ордэн "Пагоня – Жыве Беларусь!", медаль "Крыж Заслугі Б.К.А.", медаль "Беларускія ветэраны на чужыне".

*Тэма 9 Узнагародная сістэма Польшчы (1919–1939).*

Аднаўленне ордэнаў "Virtuti Militari" /5 класаў/ (1919) і Белага Арла (1921).

Заснаванне новых узнагарод: ордэн Адраджэння Польшчы /5 класаў/ (1921); Крыж Храбрых (1920), Крыж Польскіх легіянераў з Амерыкі (1920), Сілезскі Крыж на стужцы Доблесці і Заслугі /2 ступені/ (1921), Крыж Заслугі войск Цэнтральнай Літвы (1922/26), Крыж Заслугі /3 ступені/ (1923), Крыж Заслугі "За храбрасць" (1928), Крыж Незалежнасці /з мечамі і без мечаў/ (1930), Ваенны Добраахвотніцкі Крыж за вайну 1918–1921 (1939) /выпуск не адбыўся/.

*Тэма 10 Узнагародная сістэма Германіі часоў Другой сусветнай вайны (1939–1945)*

Аднаўленне ў Германіі ордэна Жалезнага Крыжа (1939). Іспанскі Крыж (1939), Крыж славы Легіёна Кондар (1939), Крыж "За ваенныя заслугі" (1939), Нямецкі Крыж (1941).

Узнагародныя медалі і знакі.

*Тэма 11 Узнагародная сістэма СССР*

Гісторыя фарміравання, спецыфічныя рысы савецкай узнагароднай сістэмы.

Ордэн Чырвонага Сцяга РСФСР. Гісторыя заснавання ордэна (1918). Статут, знакі ордэна, правілы нашэння.

Заснаванне ордэна Чырвонага Сцяга СССР (1924). Кавалеры ордэна.

Ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга РСФСР. Гісторыя заснавання ордэна (1920). Статут, знак ордэна, правілы нашэння.

Ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга БССР. Гісторыя заснавання ордэна (1924). Статут, знак ордэна, правілы нашэння.

Заснаванне ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга СССР (1928). Кавалеры ордэна.

Ордэн Леніна. Гісторыя заснавання ордэна (1930). Ордэн Леніна – вышэйшы ордэн СССР. Статут, знак ордэна, правілы нашэння. Кавалеры ордэна.

Вышэйшая ступень адзнакі – званне Героя Савецкага Саюза. Гісторыя заснавання (1934). Палажэнне. Медаль "Залатая Зорка" (1939). Кавалеры вышэйшага звання.

Ордэн Чырвонай Зоркі. Заснаванне ордэна (1930). Статут, знак ордэна, правілы нашэння. Кавалеры ордэна.

Ордэн "Знак Пашаны" (з 1988 – ордэн Пашаны). Заснаванне ордэна (1935). Статут, знакі ордэна, правілы нашэння. Кавалеры ордэна.

Вышэйшая ступень адзнакі – званне Героя Сацыялістычнай Працы. Гісторыя заснавання (1938). Палажэнне. Медаль "Серп і Молат" (1940). Кавалеры вышэйшага звання.

Першыя савецкія медалі (1938). Медалі "XX год Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі", "За адвагу", "За баявыя заслугі", "За працоўную доблесць", "За працоўную адзнаку".

Узнагароды часоў Вялікай Айчыннай вайны (1941 – 1945)

Ордэн Айчыннай вайны. Заснаванне ордэна (1942). Статут, знакі ордэна, ступені, правілы нашэння. Кавалеры ордэна. Аднаўленне ордэна як памятнай узнагароды (1985).

Ордэн Суворава. Заснаванне ордэна (1942). Статут, знакі ордэна, ступені, правілы нашэння. Кавалеры ордэна.

Ордэн Кутузава. Заснаванне ордэна (1942). Статут, знакі ордэна, ступені, правілы нашэння. Кавалеры ордэна.

Ордэн Аляксандра Неўскага. Заснаванне ордэна (1942). Статут, знак ордэна, правілы нашэння. Кавалеры ордэна.

Ордэн Багдана Хмяльніцкага. Заснаванне ордэна (1943). Статут, знакі ордэна, ступені, правілы нашэння. Кавалеры ордэна.

Медаль "Партызану Айчыннай вайны" (1943).

Ордэн "Перамога". Заснаванне ордэна (1943). Статут, знак ордэна, правілы нашэння. Кавалеры ордэна.

Ордэн Славы. "Салдацкі" ордэн. Заснаванне ордэна (1943). Статут, знакі ордэна, ступені, правілы нашэння. Поўныя кавалеры ордэна.

Навацыі ва ўзнагароднай сістэме ў 1943 г.

Ордэн Ушакова. Заснаванне ордэна (1944). Статут, знакі ордэна, ступені, правілы нашэння. Кавалеры ордэна.

Ордэн Нахімава. Заснаванне ордэна (1944). Статут, знакі ордэна, ступені, правілы нашэння. Кавалеры ордэна.

Медалі Ушакова і Нахімава (1944).

Званне і ордэн "Маці-гераіня". Заснаванне ордэна (1944). Статут, знак ордэна, правілы нашэння. Кавалеры ордэна.

Ордэн “Мацярынская слава”. Заснаванне ордэна (1944). Статут, знакі ордэна, ступені, правілы нашэння. Кавалеры ордэна.

Медалі “За абарону Адэсы”, “За абарону Севастопаля”, “За абарону Ленінграда”, “За абарону Сталінграда”, “За абарону Масквы”, “За абарону Каўказа”, “За абарону Савецкага Запаляр’я”, “За абарону Кіева”;

“За ўзяцце Будапешта”, “За ўзяцце Кенігсберга”, “За ўзяцце Вены”, “За ўзяцце Берліна”;

“За вызваленне Белграда”, “За вызваленне Варшавы”, “За вызваленне Прагі”;

“За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг.”, “За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг.”, “За перамогу над Японіяй”.

Узнагароды пасляваеннага часу

Узнагародныя медалі.

Ордэн Кастрычніцкай Рэвалюцыі. Заснаванне ордэна (1967). Статут, знак ордэна, правілы нашэння. Кавалеры ордэна.

Ордэн “За службу Радзіме ва Узброеных Сілах СССР”. Заснаванне ордэна (1974). Статут, знакі ордэна, ступені, правілы нашэння. Кавалеры ордэна.

Ордэн Дружбы народаў. Заснаванне ордэна (1972). Статут, знак ордэна, правілы нашэння. Кавалеры ордэна.

Ордэн Працоўнай Славы. Заснаванне ордэна (1974). Статут, знакі ордэна, ступені, правілы нашэння. Кавалеры ордэна.

Ордэн “За асабістую мужнасць”. Заснаванне ордэна (1988). Статут, знак ордэна, правілы нашэння. Кавалеры ордэна.

Ганаровыя званні “Горад-герой” (1965), “Крэпасць-герой” (1965). Ганаровыя званні СССР.

*Тэма 12 Узнагародная сістэма Рэспублікі Беларусь*

Гісторыя фарміравання, спецыфічныя рысы ўзнагароднай сістэмы Рэспублікі Беларусь.

Медаль Францыска Скарыны. Заснаванне медаля (1988).

Закон Рэспублікі Беларусь “Аб дзяржаўных узнагародах Рэспублікі Беларусь” (1995).

Найвышэйшая ступень адзнакі – званне “Герой Беларусі”. Заснаванне звання (1995). Палажэнне. Медаль Героя Беларусі.

Героі Беларусі.

Ордэн Айчыны. Заснаванне ордэна (1995). Палажэнне, знакі ордэна, ступені, правілы нашэння. Кавалеры ордэна.

Ордэн Воінскай Славы. Заснаванне ордэна (1995). Палажэнне, знак ордэна, правілы нашэння. Кавалеры ордэна.

Ордэн Кастуся Каліноўскага. Заснаванне ордэна (1995). Палажэнне, знак ордэна, правілы нашэння. Скасаванне ордэна (2004).

Ордэн Францыска Скарыны. Заснаванне ордэна (1995). Палажэнне, знак ордэна, правілы нашэння. Кавалеры ордэна.

Ордэн Маці. Заснаванне ордэна (1995). Палажэнне, знак ордэна, правілы нашэння. Кавалеры ордэна.

Медаль “За адвагу” (1995) і інш.

Ордэн “За службу Радзіме”. Заснаванне ордэна (1997). Палажэнне, знакі ордэна, ступені, правілы нашэння. Кавалеры ордэна.

Ордэн “За асабістую мужнасць”. Заснаванне ордэна (1997). Палажэнне, знак ордэна, правілы нашэння. Кавалеры ордэна.

Ордэн Пашаны. Заснаванне ордэна (1997). Палажэнне, знак ордэна, правілы нашэння. Кавалеры ордэна.

Ордэн Дружбы народаў. Заснаванне ордэна (2002). Палажэнне, знак ордэна, правілы нашэння. Кавалеры ордэна.

Ордэн Працоўнай славы (2017). Кавалеры ордэна.

Ордэн “За ўмацаванне міру і дружбы” (2017). Кавалеры ордэна.

Ордэн “За воінскую доблесць” (2022)

Узнагародныя медалі. Ганаровыя званні.

Закон Рэспублікі Беларусь “Аб дзяржаўных узнагародах Рэспублікі Беларусь” (2004).

## ВУЧЭБНА–МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | семінар. заняткі | | |
| 1 | Уводзіны. Прадмет, задачы і крыніцы фалерыстычных даследаванняў. Гістарыяграфічны агляд | 1 | | | |
| 2 | Тэма 1 Узнагародная атрыбутыка антычнага свету | 1 | | | |
| 3 | Тэма 2 Манаскія, духоўна-рыцарскія і свецкія ордэны | 2 | | | |
| 4 | Тэма 3 Ордэн – узнагародны знак за вайсковыя і грамадзянскія заслугі. Медаль | 2 | | | |
| 5 | Тэма 4 Узнагародныя сістэмы Вялікабрытаніі, Гальшчыніі, Гішпаніі, Даніі, Прусіі, Францыі, Швецыі | 4 | | | |
| 6 | Тэма 5 Узнагародная сістэма Рэчы Паспалітай | 4 | 2 | | |
| 7 | Тэма 6 Узнагародная сістэма Расіі (да 1917) | 6 | 2 | | |
| 8 | Тэма 7 Узнагароды Белага Руху | | | 1 | падрыхтоўка і праверка электронных прэзентацый |
| 9 | Тэма 8 Узнагароды БНР і беларускай эміграцыі | | | 1 | падрыхтоўка і праверка электронных прэзентацый |
| 10 | Тэма 9 Узнагародная сістэма Польшчы (1919–1939) | | | 1 | падрыхтоўка і праверка электронных прэзентацый |
| 11 | Тэма 10 Узнагародная сістэма Германіі часоў Другой сусветнай вайны (1939–1945) | | | 1 | падрыхтоўка і праверка электронных прэзентацый |
| 12 | Тэма 11 Узнагародная сістэма СССР | 6 | 2 | 2 | падрыхтоўка і праверка электронных прэзентацый |
| 13 | Тэма 12 Узнагародная сістэма Рэспублікі Беларусь | 2 | 2 | 2 | падрыхтоўка і праверка электронных прэзентацый |
| | Разам | 28 | 8 | 8 | |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

Асноўная

1. Бурков, В.Г. Фалеристика: учеб. пособие / В.Г.Бурков. – Л.: Изд.центр РГГУ, 2000. – 167 с.

2. Величко, А. М. Фалеристика Беларуси / А. М. Величко. - Минск : Беларусь, 2015. - 236, [3] с. : цв. фот.

**Дадатковая**

1. Аб дзяржаўных узнагародах Рэспублікі Беларусь: закон Рэсп. Беларусь, 13 красавіка 1995 г. // Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. – 1995. – № 22–23. – Арт. 304.

2. Аб зацвярджэнні Палажэння аб званні "Герой Беларусі", ордэнах, медалях і ганаровых званнях РБ: закон Рэсп. Беларусь, 2 чэрвеня 1997 г. // Ведамасці Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. – 1997. – № 24. – Арт. 461.

3. Аб зацвярджэнні апісання ордэнаў, медалёў і нагрудных знакаў да ганаровых званняў Рэспублікі Беларусь: указ Прэзідэнта Рэсп. Беларусь, 6 верасня 1999 г. // Збор дэкрэтаў, указаў прэзідэнта і пастаноў урада Рэспублікі Беларусь. – 1999. – № 25. – Арт.707.

4. Бурков, В.Г. Историография отечественных фалеронимов и фалеристики / В.Г.Бурков. – Л.: ЛГУ, 1990. – 88 с.

5. Бурков, В.Г. Фалеристика / В.Г.Бурков. – Л.: Изд.центр РГГУ, 2000. – 164 с.

6. Всеволодов, И.В. Беседы о фалеристике. Из истории наградных систем / И.В.Всеволодов. – М.: Наука, 1990. – 336 с.

7. Дуров, В.А. Русские и советские боевые награды / В.А.Дуров. – М.: Внешторгиздат, 1989. – 107 с.

8. Елинская, М.М. Ордена, медали и нагрудные знаки Республики Беларусь / М.М. Елинская. – Минск: Беларусь, 2022. – 269 с.

9. Исаева, И.К. Награды Рэспублики Беларусь / И.К. Исаева. – Минск: Беларусь, 2007. – 120 с.

10. Колесников, Г.А. Ордена и медали СССР / Г.А.Колесников, А.М.Рожков. – М.: Воениздат, 1983. – 299 с.

11. Косарева, А.В. Искусство медали / А.В.Косарева. – М.: Просвещение, 1977. – 127 с.

12. Кузнецов, А. О Белой армии и ее наградах 1917–1922 гг. / А.Кузнецов. – М.: Столица, 1991. – 45 с.

13. О государственных наградах Республики Беларусь: закон Рэсп. Беларусь, 18 мая 2004 г. / Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. – 2004. – № 88. – С. 15–32.

14. Российские императорские и царские ордена в собрании Государственного исторического музея. – М.: ГИМ, 2003. – 159 с.

15. Смыслов, О.С. Загадки советских наград. 1918–1991 годы / О.С.Смыслов. – М.: Вече, 2005. – 352 с.

16. Спасский, И.Г. Иностранные и русские ордена до 1917 года / И.Г.Спасский. – СПб.: Дорваль, 1993. – 142 с.

17. Тетерник, А.В. Наградная система Беларуси / А.В.Тетерник // Армия. – 2001. – № 3. – С. 4–5.

18. Узнагароды Рэспублікі Беларусь / уклад. І.К.Ісаева. – Мінск: Беларусь, 2004. – 96 с.

## Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

Вучэбная работа студэнтаў накіравана на засваенне лекцыйнага матэрыялу, а таксама на самастойны пошук і падрыхтоўку інфармацыйных матэрыялаў па гісторыі заснавання і дзейнасці беларускіх музеяў.

Найбольш дзейснымі педагагічнымі методыкамі і тэхналогіямі, што накіроўваюць студэнтаў да пошуку і выкарыстання ведаў, садзейнічаюць набыццю вопыту самастойнага вырашэння задач, адносяцца:

– гісторыка-тэматычны падыход;

– тэхналогіі праблемна-модульнага навучання;

– тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці;

– камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусіі, дыялогі, абмен думкамі і інш.).

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавая, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай работы, вучэбна-метадычныя комплексы. У практыку правядзення семінарскіх заняткаў мэтазгодна ўкараняць методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя формы.

Замацаванне атрыманых ведаў мае працяг пры праходжанні вучэбнай і вытворчай практыкі ў музеях краіны, напісанні курсавой і дыпломнай работы па дадзенай дысцыпліне.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў прадугледжвае падрыхтоўку студэнтамі інфармацыйных матэрыялаў на адпаведную тэматыку, мультымедыя прэзентацый па асобных тэмах вучэбнай дысцыпліны, вывучэння дадатковых крыніц і літаратуры, падрыхтоўцы да заліку.

Самастойная работа студэнтаў накіравана на:

– фарміраванне навыкаў пошуку і аналізу розных відаў інфармацыі;

– засваенне, сістэматызацыю і трансляцыю атрыманых ведаў у будучай прафесійнай дзейнасці;

– развіццё дадатковых навукова-даследчых навыкаў.

Кантроль за выкананнем самастойнай работы з’яўляецца бягучым і рэалізуецца праз электронную пошту, індывідуальныя кансультацыі, падчас лекцыйных і семінарскіх і практычных заняткаў, а таксама падчас правядзення экзамена.